**«ЖЫЦЦЕ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ»**, помнік старажытнабеларускай літаратуры. Арыгінальны агіяграфічны твор, узнік у канцы 12 ці ў 1-й пал. 13 ст. Аўтограф не захаваўся. Тэкст змешчаны больш як у 100 спісах 14—18 ст. і вядомы ў 6 рэдакцыях. Пытанне аўтарства да канца не высветлена. Паводле адной з версій, аўтарам мог быць чалавек, які суправаджаў Ефрасінню падчас яе падарожжа ў Ерусалім. Верагодней за ўсё, твор належыць пяру або манаха Давыда, або слугі Міхаіла — абодва былі сведкамі паводзін і ўчынкаў святой ля Труны Гасподняй, а таксама ў час яе непрацяглай хваробы. Твор адносіцца да жыцій-біясаў, нескарочаных жыцій-аповесцей, прызначаных для набажэнстваў або для чытання падчас манастырскай трапезы. Складаецца з 5 частак — зачыну, 3 асн. частак, заключэння. У цэнтры апавядання — ідэальны вобраз «дабраслаўлёнай нявесты Хрыстовай — Ефрасінні», якая яшчэ ў юнацтве выбірае шлях служэння Богу. Унучка князя Усяслава Чарадзея і дачка Святаслава-Георгія, Прадслава адмаўляецца выходзіць замуж, вырашыўшы пайсці ў манастыр. Аўтар падкрэслівае цвёрдасць гэтага рашэння, тлумачыць яго богаабранасцю князёўны. У манастыры Ефрасіння-Прадслава перапісвае кнігі, выконвае місіянерскія функцыі, займаецца ўзвядзеннем цэркваў, выпісвае з Царграда абраз Прасвятой Багародзіцы Эфескай, напісаны рукой евангеліста Лукі. У канцы жыцця яна вырашыла здзейсніць падарожжа ў Ерусалім, аднак у час вандроўкі ў Святую зямлю моцна захварэла. Праз 24 дні Ефрасіння нечакана памерла, знайшоўшы апошні прытулак у манастыры Св. Феадосія (Ерусалім). Нягледзячы на тое, што твор напісаны згодна з агіяграфічнымі канонамі, у ім сустракаюцца адступленні — гучыць матыў патрыятызму, услаўлення не проста хрысціянскага свету, але Бацькаўшчыны Ефрасінні — Полацка: «<...> дабраславенны ты, горад Полацк, што ўзгадаваў гэтакі парастак — Ефрасінню!».

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова